DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 23 июня 2006 г. N 5/22474

**ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**15 чэрвеня 2006 г. N 762**

**АБ НЕКАТОРЫХ ПЫТАННЯХ АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ**

(в ред. постановлений Совмина от 31.12.2006 N 1803,
от 18.09.2007 N 1185, от 17.12.2007 N 1747)

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб парадку вядзення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

Палажэнне аб парадку фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь і парадку азнаямлення з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў ім;

Палажэнне аб парадку выдачы дазволу на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

Палажэнне аб парадку выдачы пасведчанняў на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

Палажэнне аб Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры;

склад Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры.

2. Унесці ў Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 мая 2002 г. N 651 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., N 59, 5/10482), наступныя змяненні і дапаўненні:

2.1. пункт 2 дапоўніць абзацам сёмым наступнага зместу:

"дазвол дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" - дакумент, які выдаецца дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" ва ўстаноўленым парадку і з'яўляецца пацвярджэннем прадастаўленага Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі выканаўцам права на правядзенне археалагічных даследаванняў.";

2.2. у пункце 3:

у частцы першай словы "Законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 30, арт. 504)" замяніць словамі "Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195)";

частку другую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Характар дзейнасці ў дачыненні да археалагічных аб'ектаў, якія не з'яўляюцца матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, вызначаецца Міністэрствам культуры на падставе заключэння дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". Правядзенне земляных і будаўнічых работ на тэрыторыі археалагічнага аб'екта ажыццяўляецца па ўзгадненню з Міністэрствам культуры.";

2.3. у пунктах 5 і 6 словы "дзяржаўным органам аховы гісторыка-культурнай спадчыны" замяніць словамі "Міністэрствам культуры";

2.4. частку другую пункта 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Меры па ахове археалагічных аб'ектаў у зоне земляных і будаўнічых работ распрацоўваюцца арганізацыямі, якім выдадзены дазвол дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" ў адпаведнасці з дагаворамі, заключанымі дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" з юрыдычнымі, фізічнымі асобамі, якія вядуць праектаванне ў названых зонах.";

2.5. з пункта 8 словы "і распрацоўка" выключыць;

2.6. пункт 10 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"10. Міністэрства культуры, а таксама археолагі, кваліфікацыя якіх пацверджана пасведчаннем на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, маюць права сваім рашэннем прыпыніць земляныя і будаўнічыя работы ў выпадку з'яўлення пагрозы пашкоджання ці знішчэння археалагічнага аб'екта.";

2.7. пункт 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"11. Юрыдычныя і фізічныя асобы ў выпадку выяўлення археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ павінны паведаміць аб гэтым Міністэрству культуры і прыпыніць далейшае вядзенне работ.

На падставе звароту Міністэрства культуры дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" дае заключэнне аб навуковай вартасці выяўленага аб'екта і прапануе меры па яго ахове.";

2.8. частку другую пункта 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Інфармацыя аб размяшчэнні археалагічных аб'ектаў, якая атрымана ў ходзе правядзення земляных і будаўнічых работ, прадстаўляецца навуковымі арганізацыямі археалагічнага профілю, выканаўцам якіх прадастаўлена права на правядзенне археалагічных даследаванняў. Дадзеная інфармацыя ўключае ў сябе ілюстраваныя і тэкставыя матэрыялы, якія распрацоўваюцца на аснове сучасных картаграфічных матэрыялаў, узгадняюцца дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" і Міністэрствам культуры, пасля чаго зацвярджаюцца дзяржаўнымі органамі землекарыстання.";

2.9. пункт 13 дапоўніць словамі ", якая пацверджана пасведчаннем на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях";

2.10. у пункце 14 словы ", выдадзенага Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі" замяніць словамі "Міністэрства культуры".

3. Міністэрству культуры да 31 снежня 2006 г. унесці ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапанову аб пацвярджэнні статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь да дня ўступлення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь".

4. Прызнаць страціўшымі сілу:

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 1998 г. N 1590 "Аб Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры" (Собрание декретов, указов Президента и постановлений Правительства Республики Беларусь, 1998 г., N 29, арт. 758);

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 верасня 2002 г. N 1314 "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 1998 г. N 1590" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., N 111, 5/11189);

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2004 г. N 1497 "Аб унясенні змяненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 1998 г. N 1590" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004 г., N 190, 5/15225).

5. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 24 ліпеня 2006 г.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь С.СІДОРСКІ

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
15.06.2006 N 762

## ПАЛАЖЭННЕ
## АБ ПАРАДКУ ВЯДЗЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА СПІСА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Глава 1
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

1. Дадзенае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) (далей - Закон) і ўстанаўлівае парадак вядзення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей - Дзяржаўны спіс) у мэтах забеспячэння захавання звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях.

2. Дзяржаўны спіс згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 мая 2001 г. N 784 "О Перечне информационных ресурсов, имеющих государственное значение" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2001 г., N 56, 5/6111) уключаны ў Пералік інфармацыйных рэсурсаў, якія маюць дзяржаўнае значэнне, і зарэгістраваны ў Беларускім навукова-даследчым цэнтры электроннай дакументацыі.

3. Вядзенне Дзяржаўнага спіса ажыццяўляецца Міністэрствам культуры.

4. Вядзенне Дзяржаўнага спіса ўключае:

разгляд прапаноў аб наданні матэрыяльнаму аб'екту і (або) нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (далей - Навукова-метадычная рада);

падрыхтоўку праектаў пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб наданні матэрыяльнаму аб'екту і (або) нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці;

унясенне аб'ектаў, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, у Дзяржаўны спіс;

падрыхтоўку праектаў пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб пазбаўленні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і пры неабходнасці аб змяненні катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці;

выключэнне аб'ектаў, якія пазбаўлены статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей, з Дзяржаўнага спіса.

5. Дзяржаўны спіс з'яўляецца асноўным дакументам дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

## Глава 2
## СКЛАД ДЗЯРЖАЎНАГА СПІСА

6. Дзяржаўны спіс змяшчае наступныя раздзелы:

6.1. гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (незалежна ад іх паходжання);

6.2. гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія згодна з заканадаўствам знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія пры дакументальна пацверджаным беларускім паходжанні апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь у парадку, што адпавядае нормам міжнароднага права, а таксама звесткі аб увасобленых нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, носьбіты якіх пры бясспрэчным (у тым ліку прызнаным імі самімі) беларускім паходжанні (нацыянальнасці) не маюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

6.3. гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія ў парушэнне норм міжнароднага права пры дакументальна пацверджаным беларускім паходжанні апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь;

6.4. гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія зніклі ці страчаны пры нявысветленых абставінах. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, наяўнасць якіх дакументальна засведчана, пры ўмове адсутнасці бясспрэчных дакументальных звестак аб знішчэнні гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей;

6.5. гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, страты ці знікнення. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, страты ці знікнення, з указаннем прычын, што выклікаюць пагрозу, і мер, неабходных для захавання гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей.

7. Пры ўключэнні комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржаўны спіс у гэты спіс уключаецца таксама кожны з яе матэрыяльных аб'ектаў або нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, які ўваходзіць у склад комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці і па сваіх адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцях можа лічыцца асобнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

8. Кожны раздзел Дзяржаўнага спіса складаецца са звестак аб уключаных у дадзены спіс гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія змяшчаюцца ў наступных графах:

шыфр;

назва;

датаванне;

месцазнаходжанне;

катэгорыя;

дата і нумар пратакола пасяджэння Навукова-метадычнай рады;

дата і нумар пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

8.1. шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці складаецца з дзесяці знакаў па наступнай схеме:

х х х х хххххх

8.1.1. першы знак у шыфры дае спасылку на месца, дзе пастаянна знаходзіцца гісторыка-культурная каштоўнасць, па наступнай нумарацыі:

1 - Брэсцкая вобласць;

2 - Віцебская вобласць;

3 - Гомельская вобласць;

4 - Гродзенская вобласць;

5 - Магілёўская вобласць;

6 - Мінская вобласць;

7 - г.Мінск;

8 - па-за межамі Рэспублікі Беларусь;

8.1.2. другі знак у шыфры адпавядае віду гісторыка-культурнай каштоўнасці згодна з артыкулам 12 Закона:

1 - матэрыяльныя нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці;

2 - матэрыяльныя рухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці;

3 - нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці;

8.1.3. трэці знак у шыфры - катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці;

8.1.4. чацвёрты знак у шыфры прадстаўляе звесткі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці ў адпаведнасці з яе характарыстыкамі, вызначанымі ў артыкулах 13 - 15, а таксама артыкуле 1 Закона:

А - дакументальныя помнікі;

Б - запаведныя мясціны;

В - помнікі археалогіі;

Г - помнікі архітэктуры;

Д - помнікі гісторыі;

Е - помнікі горадабудаўніцтва;

Ж - помнікі мастацтва;

К - фіксаваныя нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці;

Л - увасобленыя нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці;

М - калекцыя;

Н - камплект;

8.1.5. шэсць апошніх знакаў - нумар гісторыка-культурнай каштоўнасці па парадку ўключэння ў Дзяржаўны спіс. Пры гэтым замест лічбаў нумара, якія адсутнічаюць, прастаўляюцца нулі;

8.2. назва гісторыка-культурнай каштоўнасці прымаецца Навукова-метадычнай радай на падставе прадстаўленых гістарычных звестак;

8.3. датаванне гісторыка-культурнай каштоўнасці - гэта звесткі аб даце стварэння і (або) найбольш адметных перапрацоўках, якія вызначаюцца на падставе прадстаўленых гістарычных звестак;

8.4. месцазнаходжанне - сучасны адрас, па якім размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць, або для рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей - месца іх пастаяннага знаходжання ў адпаведнасці з адрасам уласніка (уладальніка).

У выпадках змены адраса (назвы вуліцы, населенага пункта або іншае) гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржаўны спіс уносяцца неабходныя змены ў парадку, вызначаным дадзеным Палажэннем;

8.5. катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці надаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь на падставе рашэння Навукова-метадычнай рады ў адпаведнасці са звесткамі аб асаблівасцях, адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцях і адпаведна іх значнасці, вызначанай у артыкуле 16 Закона;

8.6. у графе "Дата і нумар пратакола пасяджэння Навукова-метадычнай рады" змяшчаюцца звесткі аб Навукова-метадычнай радзе, на якой разглядаліся прапановы па наданню статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, прадстаўленыя зацікаўленымі ў парадку, вызначаным дадзеным Палажэннем;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

8.7. у графе "Дата і нумар пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь" змяшчаюцца рэквізіты нарматыўнага прававога акта, якім прынята рашэнне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці матэрыяльнаму аб'екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека.

## Глава 3
## ПАРАДАК УНЯСЕННЯ ПРАПАНОЎ АБ НАДАННІ СТАТУСУ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ

9. Прапанова аб наданні матэрыяльнаму аб'екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўносіцца ў Міністэрства культуры любой юрыдычнай ці фізічнай асобай у пісьмовай форме з абавязковым яе абгрунтаваннем, за выключэннем выпадку, прадугледжанага пунктам 3 артыкула 19 Закона.

Абгрунтаванне павінна ўключаць:

звесткі аб месцазнаходжанні матэрыяльнага аб'екта або нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека, якому прапануецца надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей - аб'ект);

апісанне і мастацкую ацэнку аб'екта для вызначэння крытэрыяў надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці;

гістарычныя звесткі аб характары, аблічы, яго ўплыве на развіццё рэгіёна або рэспублікі, звесткі аб аўтары або прыналежнасці знакамітай выдатнай асобе, аб перыядзе стварэння гэтага аб'екта, яго ўладальніках і іншае;

выкапіроўку з генеральнага плана з прывязкай аб'екта да мясцовасці (для матэрыяльных нерухомых аб'ектаў);

фотаздымкі 10 х 15 см у колькасці, якая дае найбольш поўнае ўяўленне аб аб'екце;

звесткі аб уласніку (уладальніку) аб'екта (назва арганізацыі і яе юрыдычны адрас або прозвішча, імя, імя па бацьку фізічнай асобы і яе адрас прапіскі).

10. Пасля атрымання прапановы аб наданні матэрыяльнаму аб'екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Міністэрства культуры накіроўвае ўласніку (уладальніку) аб'екта, а таксама ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган інфармацыю аб разглядзе гэтай прапановы на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады.

11. Кваліфікаваны разгляд на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады прапановы, якая паступіла ў Міністэрства культуры ў парадку, вызначаным дадзеным Палажэннем, ажыццяўляецца ў тэрмін, які не перавышае 30 дзён.

Па выніках разгляду Навукова-метадычная рада выдае заключэнне аб адпаведнасці разглядаемага аб'екта крытэрыям, вызначаным у артыкуле 20 Закона, і прымае рашэнне аб унясенні прапановы ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь аб неабходнасці надання яму статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У выпадку адсутнасці магчымасці надання прапанаванаму аб'екту статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Навукова-метадычная рада прымае рашэнне з абгрунтаваннем прычын адмовы.

12. Паведамленне аб прынятым Навукова-метадычнай радай рашэнні накіроўваецца заяўніку, уласніку (уладальніку), у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган у тэрмін, які не перавышае 10 дзён з дня яго прыняцця.

13. Пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека ажыццяўляецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у выпадку страты імі іх адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей, якія абумовілі наданне ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама ў выпадку іх знішчэння, страты ці знікнення ў выніку ўздзеяння прыродных фактараў або іншых сітуацый пры немагчымасці іх аднаўлення. Заключэнне аб немагчымасці навукова абгрунтаванага аднаўлення гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей даецца Навукова-метадычнай радай.

Пры неабходнасці вырашэння выключных дзяржаўных задач помнікі археалогіі пасля іх поўнага вывучэння могуць быць пазбаўлены статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Заключэнне аб поўным вывучэнні помнікаў археалогіі даецца Навукова-метадычнай радай.

14. Праект пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, наданні катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці прапанаванаму аб'екту або пазбаўленні яго такога статусу ці змяненні пры неабходнасці катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці рыхтуецца Міністэрствам культуры пры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў год.

15. Матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, у адносінах да якіх Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняты рашэнні аб наданні ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, уключаюцца ў Дзяржаўны спіс у адпаведнасці з дадзеным Палажэннем.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
15.06.2006 N 762

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ ПАРАДКУ ФАРМІРАВАННЯ БАНКА ЗВЕСТАК АБ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ПАРАДКУ АЗНАЯМЛЕННЯ З ІНФАРМАЦЫЯЙ, ЯКАЯ ЗМЯШЧАЕЦЦА Ў ІМ

## Глава 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзенае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) у мэтах устанаўлення парадку фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь (далей - Банк звестак) і вызначэння парадку азнаямлення з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў ім.

2. Банк звестак згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 мая 2001 г. N 784 "О перечне информационных ресурсов, имеющих государственное значение" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2001 г., N 56, 5/6111) уключаны ў пералік інфармацыйных рэсурсаў, якія маюць дзяржаўнае значэнне, і зарэгістраваны ў Беларускім навукова-даследчым цэнтры электроннай дакументацыі.

3. Фарміраванне Банка звестак ва ўстаноўленым парадку ажыццяўляецца праектным рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Праектрэстаўрацыя" (далей - УП "Праектрэстаўрацыя"), упаўнаважаным на гэта Міністэрствам культуры.

4. Банк звестак уяўляе сабой сістэматызаваны збор звестак, запісаных на электронных носьбітах, аб:

гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія ва ўстаноўленым парадку ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей - Дзяржаўны спіс);

адметных выніках і сведчаннях гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі незалежна ад іх месцазнаходжання;

страчаных матэрыяльных аб'ектах, прадметах і нематэрыяльных праяўленнях творчасці чалавека, наяўнасць якіх дакументальна засведчана і якія маглі б атрымаць статус гісторыка-культурных каштоўнасцей.

5. Фарміраванне Банка звестак ажыццяўляецца за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на спецыяльныя праграмы і мерапрыемствы ў галіне культуры, іншых крыніц фінансавання, не забароненых заканадаўствам.

## Глава 2
## МЭТЫ ФАРМІРАВАННЯ БАНКА ЗВЕСТАК

6. У Банку звестак захоўваюцца на электронных носьбітах сістэматызаваная ў асобных тэматычных раздзелах інфармацыя аб каштоўнасцях, віды якіх вызначаны ў пункце 4 дадзенага Палажэння; вызначаныя ва ўстаноўленым парадку раздзелы навукова-праектнай дакументацыі на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях; іншыя матэрыялы або іх копіі, якія датычацца гісторыка-культурнай спадчыны.

7. Назапашванне інфармацыі аб каштоўнасцях у электроннай форме, а таксама збор праектных, выдавецкіх і іншых матэрыялаў, якія датычацца гісторыка-культурнай спадчыны, праводзіцца ў мэтах:

вывучэння і ўліку матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць мець гісторыка-культурную каштоўнасць, садзейнічання ў наданні ім статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей і ўключэння ў Дзяржаўны спіс;

арганізацыйнай і навукова-метадычнай дапамогі ў апублікаванні Дзяржаўнага спіса;

стварэння ўмоў для комплекснай ацэнкі наяўнага стану, функцыянальнага выкарыстання і ўтрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

фарміравання архіва вызначаных ва ўстаноўленым парадку раздзелаў навукова-праектнай дакументацыі на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, збору выдавецкіх і іншых матэрыялаў, якія датычацца гісторыка-культурнай спадчыны народа Беларусі;

садзейнічання органам дзяржаўнага кіравання, установам, грамадскім арганізацыям, грамадзянам, іншым зацікаўленым пры вырашэнні пытанняў і арганізацыі работы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, правядзенні навукова-даследчых, праектных, вытворчых і іншых мерапрыемстваў у дачыненні да гісторыка-культурных каштоўнасцей і ў зонах іх аховы;

садзейнічання арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны, спрыяння дзейнасці па вяртанню ў Рэспубліку Беларусь культурных каштоўнасцей, незаконна вывезеных за яе межы;

папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны народа Беларусі ў краіне і за яе межамі.

## Глава 3
## ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ БАНКА ЗВЕСТАК

8. Фарміраванне Банка звестак ажыццяўляецца спецыялістамі УП "Праектрэстаўрацыя", якія маюць адпаведную кваліфікацыю, што дазваляе праводзіць ім выяўленне, аналіз і рэдагаванне інфармацыі аб каштоўнасцях, занясенне яе ў электронную базу дадзеных Банка звестак, архівіраванне навукова-даследчых, праектных і іншых матэрыялаў, якія датычацца гісторыка-культурнай спадчыны (далей - спецыялісты).

9. На кожную каштоўнасць, вызначаную ў адпаведнасці з пунктам 4 дадзенага Палажэння, у Банку звестак запаўняецца ўліковы дакумент у форме электроннага пашпарта, раздзелы якога складаюць інтэрфейс Банка звестак.

10. У інтэрфейсе Банка звестак паслядоўна або ў іншым спецыяльна зададзеным парадку прадстаўлены наступныя раздзелы электроннага пашпарта:

уліковыя дадзеныя і месца знаходжання каштоўнасці, у якім прадстаўлены юрыдычны адрас каштоўнасці, і для гісторыка-культурнай каштоўнасці - шыфр адпаведна Дзяржаўнаму спісу;

абгрунтаванне статусу каштоўнасці з указаннем дзеючых нарматыўных прававых актаў, паводле якіх нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама страціўшых сілу нарматыўных прававых актаў, якімі гэты або прыраўняны да яго статус надаваўся ў папярэдні перыяд;

гістарычны адрас, які магла мець каштоўнасць пры яе стварэнні і ў далейшы перыяд існавання;

характарыстыка ўласнікаў (уладальнікаў), якая змяшчае звесткі аб уласніку (уладальніку) каштоўнасці, лакалізацыі ўладання, датах пачатку і заканчэння права ўладання, форме ўласнасці, кошце аб'екта і даце вызначэння гэтага кошту;

звесткі аб зонах аховы матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці з указаннем даты і нумара нарматыўнага прававога акта, якім зацверджаны праект зон аховы, тыпу гэтых зон, апісання межаў і рэжымаў;

звесткі аб ахоўных абавязацельствах, якія падпісаны ўласнікам (уладальнікам) каштоўнасці і зарэгістраваны ва ўстаноўленым парадку ў Міністэрстве культуры;

інфармацыя пра адказных за правядзенне работ асоб з указаннем звестак у адпаведнасці з дакументам, які дае ім права на правядзенне пэўных відаў работ;

кароткае апісанне каштоўнасці;

характарыстыка сучаснага тэхнічнага стану каштоўнасці;

звесткі аб элементах каштоўнасці, якія маюць самастойны статус гісторыка-культурнай каштоўнасці;

гісторыя фарміравання і выкарыстання каштоўнасці;

кароткая гістарычная даведка пра каштоўнасць;

графічныя матэрыялы і фотаздымкі з адлюстраваннем каштоўнасці, у тым ліку ў розныя перыяды яе існавання або бытавання;

архіўныя і бібліяграфічныя крыніцы пра каштоўнасць;

звесткі аб наяўнасці навукова-тэхнічнай дакументацыі на рэстаўрацыю і іншыя віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

У кожным раздзеле электроннага пашпарта ўказваюцца прозвішча і ініцыялы яго складальніка (спецыяліста), дата запаўнення гэтага раздзела.

Раздзелы пашпарта могуць быць дапоўнены іншымі звесткамі, якія змяшчаюць важную для характарыстыкі каштоўнасці інфармацыю.

11. Юрыдычныя і фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія з'яўляюцца заказчыкамі распрацоўкі навукова-праектнай дакументацыі на выкананне работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, у абавязковым парадку павінны перадаваць у УП "Праектрэстаўрацыя" ўстаноўленыя Міністэрствам культуры раздзелы навукова-праектнай

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

дакументацыі на ўсе віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і ў зонах іх аховы для ўнясення адпаведнай інфармацыі ў Банк звестак.

Інфармацыя перадаецца ў Банк звестак на папяровых і (або) электронных носьбітах заказчыкам распрацоўкі навукова-праектнай дакументацыі або па яго даручэнню праектнай арганізацыяй, якая выканала распрацоўку гэтай навукова-праектнай дакументацыі. Без выканання гэтага патрабавання навукова-праектная дакументацыя не падлягае ўзгадненню і дазвол на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях не выдаецца.

12. Запаўненне і дапаўненне інфармацыяй раздзелаў электроннага пашпарта (базы дадзеных), яе змяненне ў выніку выяўлення новых дадзеных праводзіцца спецыялістамі на падставе атрыманых у ходзе праведзеных навукова-даследчых і іншых мерапрыемстваў звестак або копій матэрыялаў, якія датычацца гісторыка-культурных каштоўнасцей або іншых адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, выяўленых у ходзе гэтых мерапрыемстваў.

Не дапускаецца ўчыненне перашкод спецыялістам пры выкананні імі работы па збору звестак і матэрыялаў аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь, правядзенне якой пісьмова пацвярджаецца Міністэрствам культуры або УП "Праектрэстаўрацыя". Службовыя асобы, уласнікі (уладальнікі) і карыстальнікі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, грамадзяне, кіраўнікі і супрацоўнікі навукова-праектных арганізацый, іншыя зацікаўленыя абавязаны спрыяць спецыялістам у выяўленні і атрыманні дакладнай інфармацыі і матэрыялаў аб гісторыка-культурнай спадчыне народа Беларусі.

13. За УП "Праектрэстаўрацыя", якое выконвае работу па фарміраванню Банка звестак, замацоўваюцца абсталяванне і тэхнічныя сродкі, непасрэдна прызначаныя для фарміравання Банка звестак, што дазваляюць з выкарыстаннем сучасных тэхналогій праводзіць выяўленне, фіксацыю, капіраванне, рэдагаванне і захаванне інфармацыі аб гісторыка-культурнай спадчыне, яе прадастаўленне ва ўстаноўленым парадку зацікаўленым, увядзенне ў шырокі ўжытак вызначаных раздзелаў Банка звестак з мэтай папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

## Глава 4
## ПАРАДАК АЗНАЯМЛЕННЯ З ІНФАРМАЦЫЯЙ, ЯКАЯ ЗМЯШЧАЕЦЦА Ў БАНКУ ЗВЕСТАК

14. Электронная праграма Банка звестак разлічана на прадастаўленне інфармацыі аб гісторыка-культурнай спадчыне на электронных носьбітах пры дапамозе лакальных сетак, праз глабальную камп'ютэрную сетку Інтэрнет і на папяровых носьбітах.

15. Органы дзяржаўнага кіравання, дзяржаўныя архівы і бібліятэкі, юрыдычныя і фізічныя асобы, якія бясплатна прадстаўляюць інфармацыю аб гісторыка-культурнай спадчыне для занясення яе ў базу дадзеных Банка звестак, могуць карыстацца змешчанай у ім інфармацыяй, а таксама сабранымі матэрыяламі навукова-праектнага і архіўна-бібліяграфічнага характару на бязвыплатнай аснове.

16. Іншыя зацікаўленыя могуць карыстацца інфармацыяй, прадастаўляемай згодна з пунктам 14 дадзенага Палажэння, з аплатай паслуг Банка звестак адпаведна калькуляцыі яго рэальных расходаў, зацверджанай Міністэрствам культуры.

Сродкі, атрыманыя УП "Праектрэстаўрацыя" за карыстанне інфармацыяй Банка звестак, паступаюць на адпаведны рахунак гэтага прадпрыемства і выкарыстоўваюцца на патрэбы фарміравання Банка звестак або на яго матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне.

17. Пры стварэнні ў Інтэрнеце сайта Банка звестак для агульнага азнаямлення прадстаўляюцца інфармацыя, якая адпавядае раздзелам Дзяржаўнага спіса, а таксама асобныя ілюстрацыйныя матэрыялы, неабходныя для дастатковага ўяўлення гісторыка-культурнай каштоўнасці або іншых адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі.

18. Пры выкарыстанні інфармацыі, якая змяшчаецца ў Банку звестак, спасылка на раздзелы дадзенага Банка з'яўляецца абавязковай.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
15.06.2006 N 762

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ ПАРАДКУ ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ВЫКАНАННЕ РАБОТ НА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

(в ред. постановлений Совмина от 31.12.2006 N 1803, от 18.09.2007 N 1185, от 17.12.2007 N 1747)

## Глава 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзенае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) (далей - Закон) у мэтах вызначэння парадку выдачы дазволу на правядзенне ўсіх відаў навукова-праектных і рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях (у зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей) і эталонах фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей - гісторыка-культурныя каштоўнасці), вызначаных артыкулам 36 Закона.

2. Дадзенае Палажэнне з'яўляецца абавязковым для ўсіх юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, уласнікаў (уладальнікаў), зацікаўленых у выкананні навукова-даследчых і рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях (далей - заказчык).

3. Дазвол на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях (далей - дазвол) выдаецца Міністэрствам культуры і дае права на правядзенне ўсіх відаў работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, за выключэннем выпадкаў, вызначаных у пункце 4 дадзенага Палажэння.

Дазвол не вызваляе заказчыка ад неабходнасці афармлення дакументаў у дзяржаўных органах на выкананне такіх работ у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

4. Не патрабуецца дазвол на работы па забеспячэнню належнага тэхнічнага і санітарнага стану гісторыка-культурных каштоўнасцей, у тым ліку работы па бягучаму рамонту і тэхнічнаму абслугоўванню ў межах ахоўнага абавязацельства, прадугледжанага артыкулам 44 Закона, якія выконваюцца штодзённа або з іншай перыядычнасцю.

5. Заказчыкі па распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях у абавязковым парадку павінны перадаваць у Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь раздзелы навукова-праектнай дакументацыі, якія датычацца выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і работ у зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Без выканання гэтага патрабавання дазвол не выдаецца.

## Глава 2
## ВІДЫ ДАЗВОЛАЎ І ТЭРМІН ІХ ДЗЕЯННЯ

6. Дазвол выдаецца па форме згодна з дадаткам для выканання:

навукова-даследчых і праектных работ пасля ўзгаднення і зацвярджэння абгрунтаванай праграмы навукова-даследчых работ, складзенай з удзелам назначанага навуковага кіраўніка гісторыка-культурнай каштоўнасці;

рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ пасля ўзгаднення і зацвярджэння навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

археалагічных даследаванняў пасля прадастаўлення Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі іх выканаўцам права на правядзенне дадзеных даследаванняў.

Дазвол на выкананне навукова-даследчых і праектных работ выдаецца на правядзенне:

гісторыка-архіўных і бібліяграфічных даследаванняў;

архітэктурна-археалагічных абмераў;

інжынернага даследавання будаўнічых канструкцый;

навуковых даследаванняў па зандажах і шурфах;

натурных даследаванняў;

лабараторных аналізаў, даследаванняў, выпрабаванняў матэрыялаў;

фотафіксацыі;

праектных работ;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, у тым ліку на правядзенне аўтарскага нагляду за іх выкананнем.

Дазвол на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ выдаецца для правядзення аднаўленчых работ, дапаўненняў, кансервацыі, прыстасавання, рамонту, раскрыцця, рэгенерацыі, рэканструкцыі, рэстаўрацыі.

7. Дазвол выдаецца юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам на тэрмін да канца каляндарнага года, у якім запланавана правядзенне работ, фізічным асобам (акрамя індывідуальных прадпрымальнікаў) - да канца каляндарнага года, у якім запланавана заканчэнне работ.
(часть первая п. 7 в ред. постановления Совмина от 17.12.2007 N 1747)

Пасля заканчэння тэрміну дзеяння дазволу або для працягу прыпыненай дзейнасці ў выпадках, вызначаных Законам, заказчык павінен у парадку згодна з дадзеным Палажэннем звярнуцца ў Міністэрства культуры з заявай аб выдачы дазволу на працяг работ.

## Глава 3
## ПАРАДАК ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛАЎ

8. Для атрымання дазволу заказчык, які з'яўляецца юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам, звяртаецца ў Міністэрства культуры з заявай, складзенай па форме, якая ўстанаўліваецца Міністэрствам культуры, да якой прыкладае наступныя дакументы:

копію спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на права ажыццяўлення дзейнасці "Праектаванне і ўзвядзенне будынкаў і збудаванняў I і II узроўню адказнасці і правядзенне інжынерных пошукаў для гэтых мэт";

справаздачу аб выкананых на працягу папярэдняга года работах на гісторыка-культурнай каштоўнасці (пры атрыманні дазволу на працяг работ).
(п. 8 в ред. постановления Совмина от 18.09.2007 N 1185)

9. Исключен. - Постановление Совмина от 18.09.2007 N 1185.

9-1. Пералік дакументаў і (або) звестак, якія прадстаўляе фізічная асоба, акрамя індывідуальнага прадпрымальніка, у Міністэрства культуры для атрымання дазволу, вызначаных у пункце 352 пераліку адміністрацыйных працэдур, ажыццяўляемых дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі па заявах грамадзян, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 сакавіка 2006 г. N 152 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 44, 1/7344; 2007 г., N 222, 1/8854).
(п. 9-1 в ред. постановления Совмина от 17.12.2007 N 1747)

10. Дакументы, прадстаўленыя заказчыкам, захоўваюцца ў Міністэрстве культуры на працягу тэрміну, прадугледжанага нарматыўнымі прававымі актамі Рэспублікі Беларусь.

11. У выпадку прыняцця рашэння аб паэтапным правядзенні рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ з паралельным праектаваннем Міністэрства культуры выдае дазвол на правядзенне работ паэтапна або на асобныя віды работ у парадку, вызначаным дадзеным Палажэннем.

12. Падрыхтоўка дазволу для заказчыкаў, якія з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі або індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ажыццяўляецца ў 15-дзённы тэрмін, для заказчыкаў фізічных асоб (акрамя індывідуальных прадпрымальнікаў) - у двухмесячны тэрмін з дня падачы заявы пры ўмове выканання патрабаванняў, вызначаных дадзеным Палажэннем.
(п. 12 в ред. постановления Совмина от 17.12.2007 N 1747)

13. Адмоўнае рашэнне ў выдачы дазволу афармляецца ў выглядзе пісьма інфармацыйнага характару з указаннем прычын адмовы.

14. Выдача або адмова ў выдачы дазволу на правядзенне работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці фіксуецца ў кнізе рэгістрацыі дазволаў, форма якой зацвярджаецца Міністэрствам культуры.

15. Дазвол на выкананне работ выдаецца бясплатна.

16. У выпадку змянення праектных рашэнняў на рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы, пры якіх праектная дакументацыя патрабуе паўторнага ўзгаднення і правядзення экспертызы, заказчык у месячны тэрмін пісьмова інфармуе аб гэтым Міністэрства культуры ў мэтах разгляду магчымасці працягу работ.

У выпадку пагрозы існаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці ў працэсе выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ заказчык абавязаны прыпыніць усе работы і паведаміць аб гэтым у Міністэрства культуры.

17. У выпадку перадачы правоў на правядзенне работ іншаму заказчыку або пры перадачы падраду іншай праектнай або будаўнічай арганізацыі дазвол павінен быць пераафармлены заказчыкам у Міністэрстве культуры ў двухтыднёвы тэрмін.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

18. Пры правядзенні рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ копія дазволу павінна быць на аб'екце ў выканаўцы работ, які прызначаны загадам падрадчыка і з'яўляецца адказным за выкананне работ на дадзеным аб'екце.

19. Дазвол можа быць прыпынены ў выпадках:

калі правядзенне работ не пачата ў шасцімесячны тэрмін з даты выдачы дазволу;

выяўлення факту фальсіфікацыі прадстаўленых у Міністэрства культуры дакументаў;

невыканання заказчыкам патрабаванняў пунктаў 16 і 17 дадзенага Палажэння.

Аб прыпыненні дзеяння дазволу Міністэрства культуры выдае прадпісанне, дзеянне якога захоўвае сілу да ўстранення парушэння.

20. Пасля заканчэння ўсіх работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці заказчык прадстаўляе ў Міністэрства культуры навукова-рэстаўрацыйную справаздачу аб выкананых работах, складзеную навуковым кіраўніком гісторыка-культурнай каштоўнасці, пасля чаго названае Міністэрства ў межах сваёй кампетэнцыі выдае заключэнне аб магчымасці прыёмкі ўказанай каштоўнасці ў эксплуатацыю.

Выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях без дазволу Міністэрства культуры, а таксама выкананне іншых відаў работ, не азначаных у дазволе, з'яўляецца самавольным і цягне адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

Дадатак
да Палажэння аб парадку
выдачы дазволу на выкананне
работ на гісторыка-культурных
каштоўнасцях

Форма

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДАЗВОЛ
на права правядзення работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці
ад "__" ___________ 20__ г. N ________

Дазвол сапраўдны па "__" __________ 20__ г.

У адпаведнасці з артыкулам 37 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" дазвол выдадзены ___________________________________________________________
(поўная назва юрыдычнай асобы,
_____________________________________________________________________
прозвішча, імя, імя па бацьку фізічнай асобы)

на правядзенне _______________________________________________________
(назва работ)
(у адпаведнасці з пунктам (і)
артыкула 36 названага Закона)
на гісторыка-культурнай _____________________________________
каштоўнасці катэгоры "__" (назва гісторыка-культурнай
Выканаўца работ: каштоўнасці і яе месцазнаходжанне)
генпраектная (праектная)
арганізацыя або генпадрадная _______________________________________
(падрадная) арганізацыя _____________________________________________

Асобыя ўмовы: _______________________________________________________

Аб'ект пад шыфрам ____________________ унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад "__" ____________ 20_ г. N __ (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 20__ г., N _____).

Адказным за захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці (усіх

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

яе адметных вартасцей) у працэсе работ з'яўляецца навуковы кіраўнік аб'екта, архітэктар ____________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)

_____________ ___________ _______________________________________
(пасада) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча адказнай асобы)
М.П.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
15.06.2006 N 762

**ПАЛАЖЭННЕ**
**АБ ПАРАДКУ ВЫДАЧЫ ПАСВЕДЧАННЯЎ НА ПРАВА ВЫКАНАННЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ НА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ І КІРАЎНІЦТВА РАСПРАЦОЎКАЙ НАВУКОВА-ПРАЕКТНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ НА ВЫКАНАННЕ РЭСТАЎРАЦЫЙНА-АДНАЎЛЕНЧЫХ РАБОТ НА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ**

Глава 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

(в ред. постановления Совмина от 18.09.2007 N 1185)

1. Дадзенае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) (далей - Закон) і ўстанаўлівае парадак выдачы пасведчанняў на права выканання навукова-даследчых работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях і эталонах фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей - гісторыка-культурныя каштоўнасці) і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

2. Пасведчанне на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях (далей - пасведчанне) з'яўляецца афіцыйным дакументам, які пацвярджае адпаведную кваліфікацыю яго ўладальніка і дае права допуску да выканання азначаных у ім наступных відаў работ:

археалагічныя даследаванні (разведка і раскопкі) нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, у тым ліку правядзенне нагляду пры выкананні земляных і будаўнічых работ;

архіўна-бібліяграфічныя даследаванні па высвятленню і ўдакладненню адметных дакументальных вартасцей гісторыка-культурных каштоўнасцей;

натурныя даследаванні па высвятленню і ўдакладненню адметных мастацкіх вартасцей гісторыка-культурных каштоўнасцей;

кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і аўтарскі нагляд за іх выкананнем;

работы, звязаныя з непасрэдным уздзеяннем на адметныя якасці рухомых і (або) нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх фрагменты, страта аўтэнтычнасці якіх недапушчальная.

У пасведчанні ў абавязковым парадку вызначаюцца катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, на правядзенне работ на якіх выдаецца гэта пасведчанне.

3. На ўладальнікаў пасведчанняў ускладаецца адказнасць за невыкананне палажэнняў Закона і абавязкаў, вызначаных дадзеным Палажэннем.

Глава 2
ПАРАДАК ВЫДАЧЫ ПАСВЕДЧАННЯЎ

4. Пасведчанне выдаецца па форме згодна з дадаткам бясплатна Міністэрствам культуры пасля атрымання заключэнняў Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (далей - Навукова-метадычная рада) або Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб адпаведнасці кваліфікацыйным патрабаванням кандыдатаў на іх атрыманне.

5. Пасведчанні выдаюцца на падставе пісьмовага звароту ў Міністэрства культуры навукова-даследчых, праектных, навуковых арганізацый, устаноў адукацыі, складзенага па форме, якая ўстанаўліваецца Міністэрствам культуры.

Да звароту прыкладаюцца:

копія дыплома кандыдата на атрыманне пасведчання;

фотаздымак кандыдата памерам 3 х 4 см.

(п. 5 в ред. постановления Совмина от 18.09.2007 N 1185)

6. Міністэрства культуры ў 5-дзённы тэрмін з дня паступлення звароту накіроўвае матэрыялы, указаныя ў пункце 5 дадзенага Палажэння, для разгляду на чарговым пасяджэнні Навукова-метадычнай рады, якая выдае заключэнне аб адпаведнасці кваліфікацыйным патрабаванням кандыдата на атрыманне пасведчання на права выканання работ, указаных у пункце 2 дадзенага Палажэння (за выключэннем правядзення археалагічных даследаванняў), або пісьмовы зварот у Нацыянальную акадэмію навук Беларусі аб выдачы заключэння на права правядзення археалагічных даследаванняў.

Указаныя заключэнні выдаюцца ў тэрмін, які не перавышае 30 дзён з дня паступлення звароту.

Звесткі аб заключэннях Навукова-метадычнай рады або Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб адпаведнасці кваліфікацыйным патрабаванням кандыдатаў на атрыманне пасведчання ўносяцца ў кнігу рэгістрацыі і выдачы пасведчанняў, форма якой зацвярджаецца Міністэрствам культуры.

7. У выпадку адмовы ў выдачы пасведчання ў рашэнні ўказваецца прычына адмовы і яе абгрунтаванне.

8. Падрыхтоўка пасведчання ажыццяўляецца на працягу 5 дзён пасля атрымання адпаведнага заключэння, прадугледжанага пунктам 6 дадзенага Палажэння.

(в ред. постановления Совмина от 18.09.2007 N 1185)

Пасведчанне мае нумар, які адпавядае нумару запісу ў кнізе рэгістрацыі і выдачы пасведчанняў.

Пасведчанне падпісваецца кіраўніком Міністэрства культуры або яго намеснікамі і завяраецца пячаткай гэтага Міністэрства.

Пасведчанне выдаецца непасрэдна кандыдату або па яго пісьмовай просьбе даверанай асобе.

9. У выпадку страты пасведчання выдаецца яго дублікат.

10. Пасведчанне выдаецца на тэрмін 5 гадоў.

Пасля заканчэння гэтага тэрміну выдаецца новае пасведчанне ў парадку, вызначаным дадзеным Палажэннем.

## Глава 3
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СПЕЦЫЯЛІСТА, ЯКІ МАЕ ПАСВЕДЧАННЕ

11. Спецыяліст, кваліфікацыя якога пацверджана пасведчаннем:

11.1. мае права:

прыпыняць правядзенне асобных відаў работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці пры неабходнасці даследавання і фіксацыі нанава выяўленых яе частак і дэталей, якія маюць свае адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці, пры пагрозе разбурэння канструкцый або знішчэння асобных элементаў гісторыка-культурнай каштоўнасці, пры сістэматычным невыкананні навукова-праектнай дакументацыі і ўказанняў навуковага кіраўніка;

11.2. абавязаны:

забяспечваць узаемадзеянне падраздзяленняў і суб'ектаў гаспадарчай дзейнасці, якія задзейнічаны ў распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі;

прымаць удзел у падрыхтоўцы абгрунтаванай праграмы навукова-даследчых работ;

ажыццяўляць кантроль за правядзеннем поўнага комплексу навукова-даследчых работ, у тым ліку з неабходнай фіксацыяй і аналізам у працэсе вытворчасці работ;

забяспечваць дакладнасць і паўнату вынікаў навукова-даследчых работ;

ажыццяўляць кантроль за распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі, якая складаецца з камплекта дакументаў, атрыманых па выніках правядзення навукова-даследчых работ, уключаючы матэрыялы з вызначэннем умоў і мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне каштоўнасцей, і праектна-каштарыснай дакументацыі, распрацаванай у адпаведнасці з дзеючымі нормамі;

забяспечваць навуковую абгрунтаванасць і адпаведнасць прымаемых праектных рашэнняў з умовай зберажэння адметных вартасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

забяспечваць своечасовае вырашэнне ўсіх пытанняў па праектна-каштарыснай дакументацыі, што ўзнікаюць у працэсе правядзення работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці;

прымаць удзел пры ўзгадненні і абароне праектных прапаноў і выкананай навукова-праектнай дакументацыі;

ажыццяўляць кантроль за выкананнем рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ у адпаведнасці з зацверджанай ва ўстаноўленым парадку навукова-праектнай дакументацыяй;

забяспечваць навуковую фіксацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці ў працэсе правядзення работ, фотафіксацыю да пачатку, у працэсе, а таксама пасля заканчэння работ;

прадугледжваць меры па захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці ў працэсе правядзення навукова-даследчых работ і пасля іх заканчэння, звязаных з непасрэдным уздзеяннем на яе;

адлюстроўваць у навуковай справаздачы дакладную і поўную інфармацыю, выяўленую ў працэсе правядзення навукова-даследчых работ;

матэрыялы навуковай справаздачы, падрыхтаваныя рэкамендацыі па выніках праведзеных навукова-даследчых работ своечасова прадстаўляць распрацоўшчыкам навукова-праектнай дакументацыі;

ажыццяўляць кантроль за належным выкарыстаннем прапанаваных рэкамендацый і навукова-праектнай дакументацыі ў працэсе выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

12. У выпадках невыканання спецыялістам, які мае пасведчанне, патрабаванняў дзеючага заканадаўства і абавязкаў, ускладзеных на яго ў адпаведнасці з дадзеным Палажэннем, па прадстаўленню абгрунтаваных прэтэнзій Міністэрства культуры і (або) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, у кампетэнцыю якіх уваходзяць пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны, Навукова-метадычнай радай прымаецца рашэнне аб прыпыненні дзейнасці пасведчання.

На адрас прадпрыемства, у якім працуе ўладальнік пасведчання, Міністэрства культуры накіроўвае пісьмовае паведамленне аб рашэнні Навукова-метадычнай рады.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

Дадатак
да Палажэння аб парадку выдачы
пасведчанняў на права выканання
навукова-даследчых работ на
гісторыка-культурных
каштоўнасцях і кіраўніцтва
распрацоўкай навукова-праектнай
дакументацыі на выкананне
рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на
гісторыка-культурных каштоўнасцях

Узор пасведчання на права выканання навукова-даследчых
работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва
распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі
на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ
на гісторыка-культурных каштоўнасцях

| | |
|---|---|
| МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ<br>РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ<br><br>ПАСВЕДЧАННЕ<br>N ______ | Прозвішча _______________<br>Фота 3 х 4 см Імя _______________________<br>Імя па бацьку ___________<br><br>________________________________________<br>(віды работ і катэгорыі<br>________________________________________<br>гісторыка-культурных каштоўнасцей,<br>________________________________________<br>на якія выдаецца пасведчанне)<br>________________________________________ |

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

| | |
|---|---|
| Выдадзена<br>"__" ___________ 20__ г.<br>Сапраўдна па<br>"__" ___________ 20__ г. | ______________________________________<br>______________________________________<br>________________________<br>(пасада адказнай асобы)<br>________________________<br>(подпіс адказнай асобы)<br>__________________________________<br>(прозвішча, ініцыялы адказнай асобы)<br>М.П. |

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
15.06.2006 N 762

**ПАЛАЖЭННЕ**
**АБ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЗЕ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ**

Глава 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзенае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) (далей - Закон) і ўстанаўлівае рэгламент работы і вызначае пералік пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (далей - Навукова-метадычная рада).

2. Навукова-метадычная рада з'яўляецца навукова-метадычным органам па пытаннях уліку, захавання, аднаўлення, утрымання і выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей, што ажыццяўляюцца ў мэтах збераджэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны.

3. У сваёй дзейнасці Навукова-метадычная рада кіруецца заканадаўствам і дадзеным Палажэннем.

Глава 2
ЗАДАЧЫ І КАМПЕТЭНЦЫЯ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ

4. Асноўнымі задачамі Навукова-метадычнай рады з'яўляюцца:

навукова-метадычнае забеспячэнне аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

выпрацоўка прапаноў, рэкамендацый па комплексу пытанняў аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

5. Да кампетэнцыі Навукова-метадычнай рады адносіцца:

прыняцце рашэнняў аб неабходнасці надання матэрыяльным аб'ектам і нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці або аб адсутнасці неабходнасці надання ім такога статусу;

выдача заключэнняў аб немагчымасці навукова абгрунтаванага аднаўлення гісторыка-культурных каштоўнасцей у выпадку страты імі сваіх адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей, якія абумовілі наданне ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама ў выпадку іх знішчэння, страты ці знікнення ў выніку ўздзеяння прыродных фактараў або іншых сітуацый;

разгляд прапаноў аб наданні матэрыяльнаму аб'екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, які ўключае разгляд фіксацыі, навуковую апрацоўку і мастацкую ацэнку матэрыяльнага аб'екта або нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека, для прыняцця рашэння аб неабходнасці надання матэрыяльнаму аб'екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці;

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

прыняцце рашэнняў аб неабходнасці аднясення гісторыка-культурнай каштоўнасці да пэўнай катэгорыі або аб неабходнасці змянення яе катэгорыі;

разгляд распрацаванай у адпаведным парадку навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорый "0", "1", "2" і эталонах фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і яе адабрэнне або неадабрэнне;

выдача заключэнняў аб адпаведнасці кваліфікацыйным патрабаванням кандыдатаў на атрыманне пасведчанняў на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

выдача заключэнняў аб поўным вывучэнні помнікаў археалогіі;

выкананне іншых функцый у адпаведнасці з Законам.

## Глава 3
## СКЛАД НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ І АРГАНІЗАЦЫЯ ЯЕ ДЗЕЙНАСЦІ

6. У склад Навукова-метадычнай рады ўваходзяць прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, арганізацый, якія ў сваёй дзейнасці маюць адносіны да арганізацыйных, навуковых, інфармацыйных і іншых пытанняў, што закранаюць сферу аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

7. Навукова-метадычную раду ўзначальвае старшыня Навукова-метадычнай рады, а ў яго адсутнасць - намеснік старшыні Навукова-метадычнай рады.

Старшыня Навукова-метадычнай рады:

кіруе дзейнасцю Навукова-метадычнай рады;

склікае пасяджэнні Навукова-метадычнай рады;

арганізуе работу Навукова-метадычнай рады ў адпаведнасці з дадзеным Палажэннем;

вызначае шэраг іншых пытанняў, якія падлягаюць разгляду на пасяджэннях Навукова-метадычнай рады і зацвярджае іх.

8. Сакратар Навукова-метадычнай рады забяспечвае:

арганізацыю падрыхтоўкі пытанняў для разгляду на пасяджэннях Навукова-метадычнай рады;

паведамленне членам Навукова-метадычнай рады аб часе і месцы правядзення пасяджэння Навукова-метадычнай рады, пытаннях, якія вынесены на яе разгляд;

улік прысутных на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады;

наяўнасць неабходнай дакументацыі, якая датычыцца пытанняў, вынесеных на разгляд пасяджэння Навукова-метадычнай рады;

вядзенне справаводства Навукова-метадычнай рады, афармленне протаколаў яе пасяджэнняў;

давядзенне прынятых Навукова-метадычнай радай рашэнняў да зацікаўленых.

9. Пасяджэнні Навукова-метадычнай рады праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў месяц.

10. Навукова-метадычная рада правамоцна прымаць рашэнні пры наяўнасці на пасяджэнні не менш за 2/3 яе складу.

Рашэнні Навукова-метадычнай рады лічацца прынятымі, калі за яе рашэнне прагаласавала больш за палавіну прысутных на пасяджэнні членаў Навукова-метадычнай рады. Пры роўнасці галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня Навукова-метадычнай рады, а ў яго адсутнасць - намеснік старшыні Навукова-метадычнай рады.

Па выніках абмеркавання пытанняў на пасяджэннях Навукова-метадычнай рады прымаюцца рашэнні, якія фіксуюцца ў пратаколе. Пратакол афармляецца вучоным сакратаром Навукова-метадычнай рады ў тэрмін, які не перавышае 10 дзён з дня пасяджэння.

11. Старшыня Навукова-метадычнай рады мае права афіцыйна запрашаць для ўдзелу ў яе рабоце экспертаў, прадстаўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, праектных устаноў, іншых зацікаўленых у вырашэнні пытанняў, якія датычацца гісторыка-культурных каштоўнасцей і разглядаюцца на пасяджэннях Навукова-метадычнай рады.

12. Арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці Навукова-метадычнай рады ажыццяўляецца Міністэрствам культуры.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
15.06.2006 N 762

## СКЛАД БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ

| | | |
|---|---|---|
| Грыдзюшка Уладзімір Паўлавіч | - | намеснік Міністра культуры (старшыня Навукова-метадычнай рады) |
| Чарняўскі Ігар Мяфодзіевіч | - | намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры (намеснік старшыні Навукова-метадычнай рады) |
| Міхайлава Вольга Фёдараўна | - | намеснік начальніка аддзела ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры (вучоны сакратар Навукова-метадычнай рады) |
| Бяспалая Марыя Аркадзьеўна | - | прарэктар па навуковай рабоце ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў", доктар гістарычных навук, прафесар |
| Варфаламеева Тамара Барысаўна | - | старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат мастацтвазнаўства |
| Высоцкая Надзея Фёдараўна | - | загадчык аддзела старажытнага беларускага мастацтва дзяржаўнай установы "Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь", доктар мастацтвазнаўства, прафесар |
| Жураўлёў Іван Сяргеевіч | - | вядучы спецыяліст-эксперт па архітэктуры рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Белдзяржэкспертыза Мінбудархітэктуры" |
| Ляўко Вольга Мікалаеўна | - | кіраўнік цэнтра дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", доктар гістарычных навук |
| Лакотка Аляксандр Іванавіч | - | дырэктар дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры |
| Нікіцін Віктар Дзмітрыевіч | - | старшыня Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінскага гарвыканкома |
| Сардараў Армэн Сяргеевіч | - | дэкан архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта, доктар архітэктуры |
| Сіняўскі Уладзімір Пятровіч | - | дырэктар праектнага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Праектрэстаўрацыя" |

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)